8. *Рагойша. В.* Тэорыя літаратуры ў тэрмінах: дапам. / Вячаслаў Рагойша. – Мінск: Беларуская энцыклапедыя, 2001. – 384 с.
9. *Салавей. Л. М.* Беларуская народная песня / Л. М. Салавей. – Мінск: Навука і тэхніка, 1978. – 192 с.
10. Теория литературы: учеб. пособие для студ. филол. фак. высш. учеб. Заведений: В 2 т. / под ред. Н. Д. Тамарченко. – Т. 1: Н. Д. Тамарченко, В. И. Тюпа, С. Н. Бройтман. Теория художественного дискурса. Теоретическая поэтика. – М.: Изд. центр «Академия», 2004. – 512с.

***Вячаслаў Калацэй***

# АКЦЭНТАЦЫЯ І АХОВА ЭТНАЭКАЛОГІІ І ДУХОЎНАСЦІ Ў КАЛЯНДАРНЫХ АБРАДАХ І СВЯТАХ

Гістарычны досвед найбольш стабільна існуючых у часе і прасторы народаў Азіі і Еўропы сведчыць, што сукупнасць народных святаў і будзённага побыту руральных (вясковых) асяродкаў – традыцыйны лад жыцця (толькі не мёртвая яго форма, а пластычная мадэль-аснова, прыдатная для неаадаптацый) – гарантыя *суіснавання этнасу і яго ландшафту ў стане дынамічнай раўнавагі* (гамеастаза, па сусветнавядомаму этнолагу Льву Гумілёву). Яго формы актуальны і перспектыўны, пакуль праз мадэлі святочных і будзённых паводзін выкладаецца (экспліцыруецца) мадэль свету традыцыі [5, *161-163*] – сістэма каранёвага светапогляду прадстаўнікоў этнасу. Чым бліжэй гэтая сістэма светапогляду да прыроды чалавека, яго біясацыяльных пачаткаў, тым больш устойліва асоба «ўпісана» ў свет-рэчаіснасць, а супольнасць «этнаэкалагічна» існуе ва ўласным «матчыным» ландшафце.

На што варта звярнуць увагу ва ўласным «спосабе ўпісання ў свет» этнасу, які мусіць: мінуць мяжу міленіуму; пазбавіцца шкоднага ў XXI ст., але «з бруднай вадой неахайна не выплеснуць дзіця»; не прыдбаць сабе ў будучым калапс жыццядзейнасці – становішча набітага звыклай і новай інфармацыяй камп'ютара, у якім знішчаны сістэмныя файлы? Што невынішчальна з светапогляду асобы і харчуе яе біяэнергетычны рэзерв (а глабальна – мацуе самаадназўленне этнасу і яго жыццёвы баланс з ландшафтам) стагоддзямі? Штудыі мысліўцаў (ад тэолагаў і філосафаў да лінгвістаў і прыродазнаўцаў, такіх як дацкі фізік, лаўрэат Нобелеўскай прэміі Нільс Бор – аўтар канцэпцыі «прынцыпу дадатковасці» ў навуковай ведзе, які ўводзіць у навуковую метадалогію папраўку на незалежныя ад даследчыкаў і матэматычных вылічэнняў заканамернасці існавання сусвету) сведчаць: адлюстраванне неўміручай «солі жыццяздольнасці» – не ў лагічных канструкцыях-тлумачэннях светапарадку, а ў каранёва-генетычным, напалову інтуітыўным, вольным ад штучных догмаў светаўспрыманні. І рэлігійных (згодна філосафу-традыцыяналісту Рэне Генону, рэлігія – толькі мёртвая абалонка традыцыі,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

спроба захаваць яе форму, калі змест захаваць ужо немагчыма), і навуковых (навука прызнае сваю нетатальнасць у тлумачэнні свету – таму з'явіўся «прынцып дадатковасці» – прызнанне звышзразумелага складальніка светабудовы) догм. Абедзве формы светасузірання павінны мець месца, але не касцянець [1]. Рэшткі ж каранёвага светапогляду даволі паспяхова «жывуць» і транслююцца ў міфах – у светапоглядзе традыцыі. Вядома, што на мяжы XX і XXI стагоддзя навукоўцы-гуманітарыі трывала пазбавілі слова 'міф' значэння «бессэнсоўная небыліца». Апеляваць тут можна і да прац сусветнапрызнаных гісторыкаў (Фернан Бродэль), псіхолагаў (Зігмунд Фрэйд, Карл Густаў Юнг), энцыклапедычна адукаваных філосафаў і культуролагаў (Мірча Эліядэ, Клод Леві-Строс) і інш. Ужо тое, што хто толькі міфы не вывучаў: і філосафы з гісторыкамі, і мовазнаўцы з псіхолагамі – сведчанне і інтэлектуальнай, і біялагічнай (нейрафізіялагічнай – знітаванай з заканамернасцямі працы мозгу чалавека) іх прыроды. Універсальную структуру міфаў прапануюць даследчыкі ў галіне структурнай лінгвістыкі так званай маскоўскай школы.

*Табліца № 1.* Універсальная структура міфаў

| Міфы народаў свету | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| вельмі старажытныя | цэнтральная група | | | | асаблівае месца | | |
| | | | | | міфы пра культурных герояў | | |
| салярныя, лунарныя, астральныя | Касмаганічныя | Антрапаганічныя | тэаганічныя | Эсхаталагічныя | пра татэмных продкаў | блізнячыя міфы | каляндарныя |

Этыялагічныя тэксты з такой сутнасцю ёсць у беларусаў, але часам яна «пахавана» пад няўдалымі класіфікацыямі і жанравымі падзеламі даследчыкаў фальклору і пад сацыякультурнымі «табу». Дэкадзіраванне традыцыі (высвятленне сувязі міфаў – каранёвага светапогляду – з біяэнергетычным рэзервам этнасу) – пошук яе глыбінных сэнсаў – дастаткова складаная інтэлектуальная аперацыя. Аднак пры якіх заўгодна асабістых дадзеных і інфармацыйных рэсурсах інтэлектуалам урбаністычных асяродкаў тут звычайна бракуе *інтуіцыі,* і – асабліва – *ініцыяцыі традыцыйнай культурай.*

Шлях для жадаючых «адчуць» традыцыю і далучыцца да яе – ўдзел у рытуальных практыках. На Беларусі, захаваўшай аўтэнтычныя суполкі выканаўцаў народных свят-рытуалаў, гэта магчыма. Навукоўцы вызначылі асобны (чацвёрты пасля трох асноўных: актыўнасць, «хуткі» і «павольны» сны) стан галаўнога мозгу («малітоўная» актыўнасць), у якім ён «працуе», калі чалавек – у малітве, медытацыі, экстатычным прасвятленні рытуалу. У гэтым стане кара галаўнога мозгу нібыта выключана, але ўспрынящце інфармацыі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

чалавекам ідзе, прычым ідзе, абмінаючы працэс мыслення і крытычнага аналізу. Гэты стан неабходны нам гэтак жа, як і астатнія. Калі ён адсутнічае ў жыцці асобы, парушаецца гармонія ў арганізме і пачынаюцца хваробы. У час актыўнасці кара галаўнога мозгу дарослага чалавека генерыруе альфа- і бэта-рытмы біятокаў з частатой ад 8 да 30 герцаў. Пры «малітоўнай» актыўнасці біятокі запавольваюцца да частаты 3 герцаў. Такія запаволеныя рытмы назіраюцца толькі ў немаўлят да 3-4 месяцаў. Прафесар Санкт-Пецярбургскага псіханеўралагічнага НДІ імя Бехцерава Валерый Слезін лічыць, што у такім стане «свядомасць пачынае існаваць па-за целам», а сам стан – дзейсная прафілактыка псіханеўралагічных паталогій. Эмацыянальная еднасць выканаўцаў рытуалу пашырае іх свядомасць, мацуе адчуванне псіхафізічнага задавальнення і абароненасці асобы, ладзіць энергетычны абмен з супольнасцю і прыродай; і тады мы разумеем тое, што не здольны запісаць, бо не маем словаў для абазначэння гэтага. Сувязь жа «міф↔рытуал» – бясспрэчна, асабліва рэльефна – ў календары, і нашы даследчыкі «намацваюць» гэтую сувязь. Народны каляндар беларусаў мае жорсткую часавую арганізацыю, аснова якой – астральнасць (даты святаў «Сонечнага крыжа» суаднесеныя з лунным цыклам). На астральнасці «завязана» прыродная біяэнергетыка, якая моцна ўплывае не толькі на штогадовы вегетацыйны цыкл-жыццё раслін (іх плады дагэтуль – асноўная крыніца харчавання людзей ва ўсім свеце), але і на псіхічны стан чалавека. Як лічаць даследчыкі, народныя святы Еўропы – міфарытуалы: маніфестацыі светапогляду праз *сімвалічныя* (з выкарыстаннем невербальных семіясістэм) *аповеды найважных этыялагічных тэкстаў (міфаў)*, якія тлумачаць паходжанне з'яў прыроды і культуры.

Таму святы традыцыйнага календара – гэта сімвалы, з дапамогай якіх апавядаецца сэнс (тэкст) пра цыклічную прыроду сусвету. Гэта заведзена ў антыэнтрапічных (*каб сусвет перыядычна «касмалагізаваўся», ратаваўся ад энтрапіі*) і кансерватыўных (*каб чалавечыя суполкі ўтрымлівалі сувязі, і біяэнергетычныя ў тым ліку, якія яднаюць людзей у этнас*) мэтах. «Ключ», які дэшыфруе сімволіку святочных рытуалаў, іх код, – гэта міфы. Яны – пры прыкладанні свайго зместу да заўважных (экзатэрычных, эксплііцытных) рытуальных дзеянняў-сімвалаў – тлумачаць схаваны (эзатэрычны, імпліцытны) сэнс асноўных рытуалаў традыцыі.

*Табліца № 2.* Схема дэкадзіравання традыцыі

| Сімвал (фрэймы каляндарна-абрадавай традыцыі) | + Код (міф – этыялагічны тэкст) | = Сэнс метатэксту традыцыі (мадэль свету этнакультуры) |
|---|---|---|
| рытуал: яго вербальная, пластычная ці музычная частка-ўвасабленне | аповеды пра паходжанне з'яў прыроды і культуры | інфармацыя пра цыклічнасць з'яў свету-еднасці, падпарадкаваных этапам касмалагічнага сцэнарыя |

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

Калі суаднесці структуру міфаў беларусаў з фрэймамі (з мадэлямі [3]) іх сезонных святаў, арганізаваных вакол сістэмы «Сонечнага крыжа», наш каляндар (як адна з семіясістэм традыцыі [6]) набывае сэнс тэксту-аповеду пра арыгінальную, цыклічную па характары мадэль свету. Калі абмінуць (праз адсутнасць неабходнага для гэтага вялікага аб'ёму тэксту ў межах аднаго артыкула) доўгія тлумачэнні, то: ў якасці знакаў-сімвалаў, прыстасаваных для перадачы інфармацыі пра мадэль свету беларускай традыцыі (як яна занатавана ў культуры нашых руральных асяродкаў), для яе выкладання (экспплікацыі), правамочна разглядаць розныя элементы міфарытуалаў свят «Сонечнага крыжа». Пад святамі «Сонечнага крыжа» (у дачыненні да беларускай традыцыі дэфініцыя ўжываецца з 1998 года [2, *6-13*]) звычайна маюць на ўвазе святы двух сонцаваротаў і двух раўнадзенстваў.

*Табліца 3.* Эзатэрычная сімволіка беларускага календара

| Экспліцытныя мадэлі – фрэймы святаў | Імпліцытныя складальнікі светасузірання (змешчаныя ў адпаведных рытуалах) з матывамі: |
|---|---|
| Дабравешчанне, Вялікдзень | мадэляванне касмаганічнасці (з'яўленне сусвету) |
| Купалле | мадэляванне антрапаганічнасці (з'яўленне чалавека) |
| Багач, Узвіжанне, Дзяды | ушанаванне татэмаў-продкаў і хтанічнага свету |
| Каляды | мадэляванне эсхаталогіі (знікнення сусвету) |

Апроч фрэймаў міфарытуалаў, фрагменты метатэксту культуры (яе МС) могуць быць экспліцыраваны (выкладзены для ўспрымання, распаведзены) ў традыцыі праз іншыя семіясістэмы: сімволіку вырабаў ДПМ (*выявы будовы сусвету на шаманскіх бубнах*), арнаментальныя матывы (*сімвалічная выява «сусветнага дрэва»* ў ткацтве), танец (ў *карагодах «па сонцу» – супраць гадзіннікавай стрэлкі*), традыцыйныя спевы (*розныя прыёмы інтанавання, прымеркаваныя да сезоннасці*) і г. д. Кодам, які перакладае інфармацыю пра «аптымальны спосаб ўпісання ў свет» (традыцыю), які нам настойліва запавялі, рэкамендавалі (пасля доўгатэрміновай «эксперыментальнай апрабацыі»), у кожнай з семіясістэм будуць міфы.

Калі ўлічыць этнаэкалагічныя і духоўныя праблемы еўрапейцаў апошняга часу (дэмаграфічныя, экалагічныя, ідэнтыфікацыйныя, выхаваўчыя), беларусам напачатку міленіуму проста неабходна актуалізаваць – кожнай асобе-частцы этнасу і этнасу цалкам (як сацыякультурнай адзінке міжнароднай супольнасці) – уласнае месца ў ландшафце і свеце. Педагогам, дзеячам культуры і адміністратарам настаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

час усведаміць, што гэта магчыма *праз захаванне этнаэкалагічнага светасузірання* і адпрацаваных (гуманістычна, этнапедагагічна, эстэтычна) стагоддзямі *яго форм-маніфестацый*, у якіх яго адначасова можна прывіць, – міфарытуалаў-*святаў народнага календара* (эксплікацыі каранёвага светапогляду этнасу). Вядома, што тут не абысціся без забеспячэння трансляцыі (абавязкова ў форме пераймання ад носьбітаў аўтэнтычнага фальклору, якія тут паўстаюць як аўтары «ініцыяцыі» традыцыяй) комплексу з'яў, непадзельна з імі знітаваных: традыцыйных спеваў, танцаў, народнага ДПМ. Для такой актуалізацыі патрабуецца працяглы шлях, прыступкі якога: *а)наданне галоўным народным святам статусу дзяржаўных; b)увядзенне этнапедагагічных практык у стандарты сучасных адукацыі і выхавання ад дзіцячага садка да ЎВА; c)юрыдычная абарона з'яў традыцыйнай культуры ад розных форм культурнага вандалізму (стылізацый, падробак, бескантрольнай камерцыялізацыі).* На жаль, інакш большасць з праблем этнаэкалогіі і духоўнасці для беларусаў будзе невырашальна.

### ЛІТАРАТУРА

1. *Генон, Р.* Очерки о традиции и метафизике / Р. Генон / пер. с фр. В. Ю. Быстрова. – СПб.: Азбука, 2000. – 320 с.
2. *Калацэй, В.* «Сонечны крыж» і вытокі каляндарнай абраднасці беларусаў / В. Калацэй // Вясна на Беларусі: Рэпертуарны зборнік. – Мінск: НЦТДіМ, 1998.
3. *Клюев Е. В.* Речевая коммуникация: Учебное пособие для университетов и вузов / Е. В. Клюев. – М.: Изд-во «ПРИОР», 1998. – 224 с.
4. *Кузина, С.* Клуб любознательных / С. Кузина // Комсомольская правда в Беларуси. – 2005. – №162. – С.7.
5. *Топоров, В. Н.* Модель мира / В. Н. Топоров // Мифы народов мира: Энциклопедия: В 2 т. / гл. ред. С. А. Токарев. – М.: Советская Энциклопедия, 1987. – Т.2: К – Я.
6. *Элиаде, М.* Священное и мирское / М. Элиаде / пер. с фр., предисл.и комплект. Н. К. Гарбовского. – М.: Изд-во МГУ, 1994. – 144 с.

*Алена Боганева*

## ТРАНСФАРМАЦЫЯ НЕКАТОРЫХ МАТЫВАЎ НОВАЗАПАВЕТНЫХ АПОКРЫФАЎ У НАРОДНА-БІБЛЕЙСКІХ НАРАТЫВАХ БЕЛАРУСАЎ

Пісьмовымі крыніцамі вусных народна-біблейскіх наратываў беларусаў і іншых славянскіх народаў з'яўляюцца Свяшчэннае Пісанне (Стары і Новы запаветы), Свяшчэннае Паданне, стара- и новазапаветныя апокрыфы. Сюжэты, тэмы, дзеючыя асобы і вобразы Свяшчэннага Пісання становяцца асновай так званай «народнай Бібліі», якая дапаўняецца, удакладняецца,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ